*Марыя Касцюкевіч*

# ВЁСКА МАЯ АДЗІНАЯ…

Мая вёска на першы погляд нічым не адметная сярод іншых. Яна сустракае мядоцкіх гасцей і калі ехаць з Барысава праз Ухалоду, і калі ехаць іншым шляхам – праз Навасады. Усё роўна, перш чым трапіць у Мётчу, вы спачатку ўбачыце шыльдачку «Аскеркі». Чужым гэта назва ні аб чым не скажа, а ў мясцовых яна суадносіцца з прозвішчам Аскерка, якое і зараз распаўсюджана на Барысаўшчыне. Адзіная версія паходжання назвы маёй вёскі звязана з аднайменным прозвішчам памешчыка, якому да рэвалюцыі належалі тутэйшыя людзі і землі. Магчыма, ён быў неблагім гаспадаром і чалавекам, калі аб ім пакінулі памяць. Таму што на месцы сённяшняй вёскі раней быў проста панскі хутар, а вакол яго размяшчаліся і іншыя хутары. Назвы ў іх былі таксама цікавыя: Казёнкі, Дубраўка, Купейка, Мір. Былі яшчэ Першы Хутар, Другі Хутар, Трэці Хутар. Затым, пасля рэвалюцыі, хутары ліквідавалі, перавезлі хаты ў адно месца. Утвораную з хутароў вёску назвалі Аскеркі. А памяць аб хутарах, а правільней сказаць, аб іх уладальніках, засталася ў назвах урочышч: Шчуцкае балота, Пятроў востраў, Палоннікава ляда, Любачкава балота. Але і само слова «хутар» не выйшла з ужытку – яно стала неафіцыйнай назвай вёскі Аскеркі. У побытавых зносінах людзі так і кажуць: жыве на Хутары, у нас на Хутары, я хутаранскі і г. д. Таму дазвольце і мне карыстацца калі-нікалі гэтым словам.

Каб трапіць у Аскеркі з цэнтра – Мётчы, трэба прайсці паўз Мётчанскую амбулаторыю, сельскі Дом культуры, дзіцячы садок. Затым спусціцца з горкі да рэчкі Мужанкі. Яна і ёсць мяжа, якая раздзяляе дзве вёскі. Спакон вякоў, як гавораць старыя, хадзілі цераз раку па кладцы. Колькі ўжо кладак знесла паводкай за доўгі час! Праўда, цяперашняя служыць ужо даўно. Я хаджу па ёй амаль дзесяць год. Зімой яна небяспечная: слізкая, нахіленая у адзін бок. Але ўпэўненасці надае тое, што трымаюцца дошкі на металічнай апоры. Ёсць у Аскеркі яшчэ дзве дарогі, шасейныя, цераз масты, але гэтая, па кладцы, бліжэйшая, бо прыводзіць адразу да хутаранскіх хат.

Першая вуліца так і называецца – Зарэчная. Яна цягнецца ўздоўж ракі, на ёй дваццаць дамоў, два з іх нежылыя, а сем – лецішчы, куды прыязджаюць толькі ў агародна-ягадны перыяд. Славіцца гэта вуліца дзвюма легендарнымі асобамі, якія пайшлі ўжо з жыцця.

Усяго год назад не стала Касцюковіча Яфіма Ільіча – салдата, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, да якога з пашанай ставіліся людзі і ніколі не зайздросцілі яго ветэранскім ільготам, бо ваяваў Аўхім Іллюшкаў (такая была яго вясковая мянушка) у Ленінградзе, усе тры блакадныя гады стаяў у абароне. Быў паранены, пасля вайны ўсё жыццё пражыў у роднай вёсцы, меў вялікую сям'ю – 6 дзяцей, шмат і шчыра працаваў. А на гулянках быў спрытным танцорам. Яго ўнука Юрыя, які займаўся ў фальклорным гурце «Берагіня», мясцовыя старажылы на канцэртах пазнавалі па адмысловай паставе ног, так і казалі: «Гэта ўжо точна Аўхімаў унук».

Памятны ўсім яшчэ адзін хутаранскі Касцюковіч – Ілья Іванавіч, 1916 г.н. Гэта сапраўды быў унікальны чалавек. Ён быў сведкам мінулай вайны і адметны быў асаблівай манерай апавядаць пра перажытае. Гэта быў выбух фантазіі, ланцужок неверагодных падзей, якія спляталіся і закручваліся ў адмысловыя сюжэты. Такога ў жыцці ніколі не магло быць і не было, але пра дзядзьку Іллю ніхто не казаў: «Манюка!» – аповеды яго былі вельмі смешнымі і заўсёды падабаліся людзям. Расказ пра чарацінку, якая выратавала Іллю ад немцаў, бо ён праз яе дыхаў пад тоўшчай ільду ў рацэ цэлыя тры дні, і расказ пра матацыкл, на якім ён уцёк без бензіну, пры дапамозе напханай у бензабак і запаленай саломы, былі надрукаваны ў 1983 годзе ў кнізе Ніла Гілевіча «Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі». Іх запісала ад Іллі наша настаўніца, калі вучылася на першым курсе ўніверсітэта.

Але пойдзем далей. Цэнтральнай з'яўляецца ў нас вуліца Падгорная. Яна шырокая, прасторная. Пачынаецца ад ракі і вядзе ўгару, адсюль і назва. Дарэчы, назвы ў вуліц з'явіліся нядаўна, іх прыдумалі і ўвялі для адміністрацыйнай зручнасці. Падгорная пачынаецца з дома Раманоўскіх Івана Сяргеевіча, 1939 г.н., і Клаўдзіі Уладзіміраўны, 1930 г.н., , ужо нябожчыкаў. Клаўдзю (так вымаўлялі яе імя людзі) ўзгадваюць як адмысловую прыпевачніцу. У яе быў такі прыгожы і моцны голас, што на вечарынках яго чуваць было ў суседніх вёсках. Клаўдзю пазнавалі яшчэ і па зместу прыпевак. Іх старыя людзі называюць у нас «рахлівымі». Яны дзесяткамі ліліся ад «брахуллі» на гулянках, але людзі не асуджалі Клаўдзю, бо «брахала» яна па-майстэрску. Паслядоўніцай бабы Клаўдзі ў гэтай справе засталася ў нашай вёсцы Надзея Ціханаўна Палонік (па-вясковаму Масееўна – ад мянушкі мужа), 1941 г.н. Яна таксама жыве на Падгорнай, толькі ў цэнтры вёскі.

На Падгорнай знаходзіцца і мой дом. Тут жылі некалі мае дзядуля і бабуля па тату, Касцюкевіч Пятро Іванавіч, 10 жніўня 1921 г.н., і Касцюкевіч Анастасія Аляксееўна, 14 кастрычніка 1927 г.н. Мой тата, Ігар Пятровіч, 20 сакавіка 1964 г.н., малодшы ў сям'і, таму і хата засталася яму ў спадчыну. Правільней сказаць, месца, або «адонне», таму што мы жывём у новай хаце, пабудаванай побач з дзедавай. У спадчыну засталася нам і мянушка дзеда. Яго звалі Прыцэлам, бо ён рабіў усё не спяшаючыся, «прыцэльваючыся», каб не памыліцца. Таму і мы ў вёсцы - Прыцэлавы дзеці і ўнукі. У нашай сям'і трое дзяцей: сястра Алёна, 2 жніўня 1986 г.н., працуе медсястрой, яна замужам і гадуе сынка Андрэйку. Брат Ігар, 30 верасня 1989 г.н., служыць у войску. Мая мама, Ганна Фёдараўна, 22 студзеня 1962 г.н., працуе сацыяльным работнікам, яе падапечныя бабулі і дзядулі жывуць у розных вёсках, таму ёй даводзіцца шмат хадзіць і працаваць. У нас

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яшчэ жыве мая бабуля па маці, Шыла Ядвіга Адамаўна, 15 красавіка 1929 г. н. Але яна вельмі хворая, нават не размаўляе.

Непадалёку ад нашай сядзібы знаходзіцца самы вялікі і прыгожы ў Аскерках дом. Пастаянна ў ім ніхто не жыве, прыязджаюць толькі летам дзеці і ўнукі. Яго былыя гаспадары – вельмі шаноўныя людзі не толькі ў нашай вёсцы, але і Мядоцкім краі. Сцяпан Сямёнавіч Волах – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, усё пасляваеннае жыццё адпрацаваў настаўнікам пачатковых класаў у былой Дроздзінскай школе, а яго жонка, Валянціна Архіпаўна Волах, па адукацыі была медыкам, у маладосці працавала фельчарам-акушэрам, а затым загадчыцай дзіцячага садка у Мётчы. Іх дачка Ірына Волах была першай выпускніцай нашай школы, якая атрымала залаты медаль. Затым Ірына скончыла медыцынскі інстытут у Мінску і зараз працуе ўрачом у абласной бальніцы.

Праз адзін дом пасля Волахаў жыве Галіна Іванаўна Мініч. Ёй каля

80-ці год. Яе муж, Мініч Восіп Пятровіч, таксама, як і дзед Аўхім, ваяваў у блакадным Ленінградзе, быў шафёрам на ваеннай машыне, якая пад абстрэлам немцаў дастаўляла ў горад хлеб. Галіна Іванаўна доўгія гады працавала начальнікам нашай Мётчанскай пошты, яе любілі і любяць людзі за добры характар і прыгажосць. Яе адзіны сын з нявесткай і ўнукамі часта прыязджаюць з Мінска і дапамагаюць ёй. У іх таксама вельмі дагледжаны і прыгожы дом.

Самая доўгая і населеная вуліца ў Аскерках – Падлесная. На ёй – дваццаць чатыры дамы, з іх два нежылыя і шэсць лецішч. Вуліца размешчана перпендыкулярна Падгорнай і «злучае» два аўтобусныя прыпынкі з розных бакоў вёскі. Лес не так ужо і блізка, але паміж ім і вуліцай - толькі поле, таму і назвалі вуліцу Падлеснай.

Бліжэй да фермы ( самой авечкагадоўчай фермы даўно няма, на яе месцы зараз знаходзіцца боулінг-пляцоўка) жыве вельмі цікавая і вядомая сям'я: Мікалай Іванавіч і Таццяна Сяргееўна Бабіцкія і 9 іх дзяцей. У дзяцей розныя імёны і прозвішчы, бо ўсе яны – прыёмныя. Але, вырастаючы, яны не забываюць сваіх прыёмных бацькоў, таму што вельмі працавітыя і добрыя, такімі іх выхавала гэта сям'я. Таццяна Сяргееўна – выдатная майстрыха: швачка, вышывальшчыца, мадэльер. Некалі, да выхаду на пенсію, яна была касцюмерам фальклорнага гурта «Берагіня», яе партрэт змешчаны ў нашай гасцёўні.

Тут жа, у гасцёўні, у галерэі «Носьбіты мастацкіх традыцый Мядоччыны» ёсць партрэт яшчэ аднаго майго земляка – Альберта Браніслававіча Крачкоўскага, 1937 г.н. Ён таксама жыве на Падлеснай, вядомы ў наваколлі як добры гаспадар і сем'янін, а яшчэ як выдатны гарманіст. Ён заўсёды, калі быў малады і здаровы, весяліў людзей музыкай і прыпеўкамі, якія сам сабе падпяваў. І зараз калі-нікалі ён іграе, але толькі для сваёй сям'і.

На гэтай жа вуліцы, толькі на другім яе краі, знаходзіцца летні дом нашага кіраўніка Міколы Аляксеевіча Козенкі і яго сям'і. Раней у доме жылі Адам Якаўлевіч, 1922г.н., і Кацярына Аляксандраўна Шчуцкія, 1923 г.н., вельмі дбайныя гаспадары. Дзяцей у іх не было, таму і прадалі яны свой дом. Але Мікола Аляксеевіч таксама трымае яго ў парадку, старанна рамантуе і дабудоўвае.

Каля Міколы Аляксеевіча жыве Іна Пятроўна, мама Сяргея Сцепановіча, былога ўдзельніка «Берагіні», які добра танчыў, іграў на гармоніку і цудоўна расказваў мясцовыя казкі, нават прыдумваў некаторыя сам. А яшчэ Сяргей пісаў даследчыя работы, у якіх расказваў пра даўні побыт, працоўныя і святочныя традыцыі нашых Аскерак, пра сваіх блізкіх і далёкіх продкаў. Зараз Сяргей працуе ў эканамічным аддзеле вядомага завода «БАТЭ».

Ёсць на вуліцы Падлеснай дом, дзе жывуць бабуля Валя і дзед Віця Раманавы. Расказваюць, як даўным-даўно, калі яны толькі пажаніліся, загарэўся іх дом. Пажар быў страшны. Людзі збегліся і ўсім сялом змагаліся з агнём. Але дом палаў. А тут яшчэ ўзняўся вецер. Магла загарэцца ўся вёска. І тады адна бабуля распранулася дагала, узяла ў рукі ікону і тры разы абышла вакол пажару. І ўсе ўбачылі, як агонь сабраўся «свечачкай» і пачаў гарэць уверх, пакуль пажар не скончыўся. А дом хутка пабудавалі новы. Таму што ўся вёска дапамагала, хто чым мог.

На Падлеснай, насупраць аўтобуснага прыпынку, жыла ветэран педагагічнай працы, старэйшая жыхарка нашай вёскі Аляксандра Фёдараўна Касцюковіч (памерла ў 2009 годзе). Яе муж, Васіль Ігнатавіч, таксама быў настаўнікам і завучам нашай школы. Яны, па ўспамінах вяскоўцаў, былі вельмі добрымі людзьмі і суседзямі. А яшчэ з гонарам звалі сябе беларусамі і размаўлялі - і дома і ў школе - толькі па-беларуску.

Ад Падлеснай да ракі Мужанкі перпендыкулярна цягнецца яшчэ адна хутаранская вуліца – Лугавая. Тут таксама, як і ва ўсёй вёсцы, жылі некалі і жывуць зараз мае землякі і сваякі. Толькі раней, як расказваюць людзі, сем'і былі шматдзетныя, таму і вёска была звонкая і вясёлая. На Лугавой жыве сям'я маёй цёткі па маці, Наталлі Фёдараўны Абрамовіч. А сястра дзядзькі Грышы, яе мужа, працуе зараз у нашай школе. Інэса Уладзіміраўна – школьны бібліятэкар і касцюмер нашай «Берагіні».

Можна бясконца расказваць пра маю вёску і яе людзей. Я чула ад старэйшых, што хутаранцы – самы спагадлівы і шчыры народ, што на Хутар, калі на Тройцу тут праходзіў кірмаш, заўсёды прыязджала многа гасцей, іграла музыка. Людзі ўмелі святкаваць і працаваць. Шкада, што зачыняюцца ў маёй вёсцы на зіму вокны і дзверы многіх дамоў, што некаторыя зусім пусцеюць. Хачацца, каб дзеці і ўнукі помнілі сваіх продкаў, даглядалі свае родныя хаціны. Тады будзе надзея, што вёска Аскеркі стане радзімай яшчэ для многіх пакаленняў мясцовага люду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ